# ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАЯ АБАРОНА ЯК ПАЎНАВАРТАСНАЯ СІЛА ВАЕННАГА РЭАГАВАННЯ

## У Гомелі пад кіраўніцтвам міністра абароны адбыўся штогадовы збор «Ваенная бяспека і абарона дзяржавы»

**У зборы ўзялі ўдзел старшыні абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, ваенныя камісары абласцей і сталіцы. У адпаведнасці з рашэннем кіраўніка дзяржавы мерапрыемства праводзіцца дзявяты раз. Яго мэта — павышэнне ўзроўню ведаў кіруючага складу рэгіянальных выканаўчых камітэтаў па пытаннях абароны дзяржавы і тэрытарыяльнай абароны.**

Як падкрэсліў **міністр абароны Віктар ХРЭНІН,** сёлета месцам правядзення збору Гомельская вобласць была выбрана невыпадкова. «Усе мы з'яўляемся сведкамі канфлікту паміж Расіяй і Украінай, — заўважыў кіраўнік абароннага ведамства. — Канфлікту, які быў па-майстэрску створаны і накіроўваецца рукамі ЗША і Вялікабрытаніі з задзейнічаннем рэсурсаў Еўропы. Ён прывёў да таго, што каля межаў Беларусі, у непасрэднай блізкасці ад нас, гінуць мірныя людзі, нашы браты — з аднаго і другога бакоў».

Генерал-лейтэнант звярнуў увагу на тое, што сучаснае развіццё ваенна-палітычнай абстаноўкі ў свеце і непасрэдна вакол Рэспублікі Беларусі патрабуе асаблівай увагі да пытанняў абараназдольнасці краіны. «Як адзначаў у сваіх выступленнях кіраўнік дзяржавы, усе нашы партнёры павінны ведаць, што беларуская міралюбнасць не сінонім ахвярнасці і што ў выпадку любой агрэсіі адказ будзе хуткі, жорсткі, адэкватны, — падкрэсліў Віктар Хрэнін. — Мы вывучаем і аналізуем развіццё сітуацыі ва Украіне, але ўжо цяпер можна зрабіць выснову, што процідзеянне надыходзячым войскам ажыццяўляецца комплексна ўсімі наяўнымі сіламі не толькі ваеннай арганізацыі дзяржавы, але і мясцовымі органамі ўлады. Тэрытарыяльная абарона з сістэмы забяспечвальнай трансфармуецца ў паўнавартасную баявую».



Па словах Віктара Хрэніна, сучасная абстаноўка вызначае неабходнасць больш цеснага ўзаемадзеяння кіраўнікоў абласцей і раёнаў, ваенных камісараў і камандуючых войскамі не толькі пры правядзенні мерапрыемстваў аператыўнай і баявой падрыхтоўкі, але і для падрыхтоўкі тэрыторыі і насельніцтва.

Для ўдзельнікаў збору на тэрыторыі Гомельскай вобласці быў праведзены розыгрыш эпізоду практычных дзеянняў войскаў па абароне аб'ектаў тэрытарыяльнай абароны на вадзе.

Згодна з заданнем, адбылося рэагаванне на інфармацыю аб знаходжанні паблізу чыгуначнага моста групы невядомых. Пры правядзенні разведкі высветлілася, што гэта дыверсійна-разведвальная група саперніка. Камандзірам падраздзялення тэрытарыяльных войскаў было прынята рашэнне па нанясенні агнявога паражэння. Задзейнічалі артылерыю, зенітную ўстаноўку. Ваеннаслужачыя тэрытарыяльнай абароны заблакіравалі раён знаходжання ДРГ. Для знішчэння дыверсантаў былі задзейнічаны байцы Сіл спецыяльных аперацый, якія на верталёце Мі-8 дэсантаваліся і знішчылі групу, захапіўшы ў палон аднаго з яе ўдзельнікаў. На верталёце яго даставілі для допыту ў штаб тэрытарыяльнай абароны.



Практычна ва ўсіх абласных цэнтрах ёсць рэкі, таму адпрацоўка аховы мастоў і іншых аб'ектаў, як падкрэсліў міністр абароны Беларусі, асабліва актуальная. Між тым на базе адной з вайсковых часцей, размешчанай на тэрыторыі рэгіёна, удзельнікі збору пазнаёміліся з асноўнымі і перспектыўнымі ўзорамі ўзбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі, сучаснымі сродкамі аказання першай дапамогі, беспілотнымі авіяцыйнымі комплексамі. Усімі прадстаўленымі ўзорамі ўзбраення сёння забяспечана тэрытарыяльная абарона.

«Мы ўжо практычна поўнасцю адпрацавалі ўвесь цыкл падрыхтоўкі Закона «Аб народным апалчэнні», правялі эксперыменты на тэрыторыі некаторых сельскіх саветаў і бачым, што гэта дае вельмі станоўчы вынік, людзі актыўна адгукаюцца, гатовы ўдзельнічаць у абароне нашай Радзімы», — адзначыў у інтэрв'ю журналістам Віктар Хрэнін. Па словах кіраўніка ваеннага ведамства, падчас збору ў тым ліку падведзены вынікі дзейнасці тэрытарыяльнай абароны за мінулы год, вызначаны новыя шляхі і кірунак развіцця.

На адным з навучальных месцаў была прадэманстравана адпрацоўка абароны населенага пункта з апорай на ўмацаваны раён. «Падкрэслю, што ўсё, што мы робім, накіравана толькі на адно: каб нашы людзі былі ўпэўнены ў будучыні, спакойна маглі гадаваць дзяцей, жыць на роднай зямлі», — падкрэсліў міністр абароны.

У ходзе збору было адкрыта новае сучаснае стрэльбішча, якое размясцілася на ўчастку плошчай больш чым 4 гектары. Яго максімальная прапускная здольнасць — ад 150 да 200 чалавек у суткі. На аб'екце створаны ўмовы вучэбнай абстаноўкі, максімальна набліжаныя да тых, што запатрабаваны ў рэальным вядзенні баявых дзеянняў.

Новая падрыхтоўча-трэніровачная пляцоўка створана для адпрацоўкі практыкавання па стральбе, правядзення тактычных вучэнняў, вырашэння агнявых задач па практычным прымяненні правіл стральбы, кідання ручных вучэбна-імітацыйных гранат, падрыхтоўцы баявых прыпасаў. Канструктарскае рашэнне тэрыторыі стварае бяспеку як для ўсіх прысутных на тэрыторыі, так і для насельніцтва ў раёне стрэльбішча.

— У выпадку надзвычайнай сітуацыі губернатар — кіраўнік тэрытарыяльнай абароны, — адзначыў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО,** — таму трэба не толькі ўмець страляць, але і, галоўнае, арганізаваць работу ўсёй тэрытарыяльнай абароны. Таму падчас збораў мы працуем на ўсіх участках, дзе вызначаны розныя падыходы, бо важна разумець, якім чынам і як вырашаюцца пастаўленыя задачы.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота БелТА.**

Ноу-хау

# ГАРАНТ БЯСПЕКІ І МІРНАГА НЕБА

## Чым здзівіла XI Міжнародная выстаўка ўзбраення і ваеннай тэхнікі MILEX-2023?

**Ужо каторы год сталічная «Мінск-арэна», найперш знакамітая як спартыўная пляцоўка, напрыканцы вясны пераўтвараецца ў зброевы салон. Сёлета айчынным ваенна-прамысловым комплексам традыцыйна былі прадстаўлены тэхнічныя навінкі, навуковыя даследаванні і інавацыйныя тэхналогіі. Свае дасягненні ў абароннай сферы прадэманстравалі і нашы партнёры з Расіі, Кітая і Ірана — разам з беларускімі ўзорамі ўсяго паўтысячы перадавых распрацовак.**

Выстаўка выклікала цікавасць у прадстаўнікоў як мінімум 30 краін — менавіта столькі замежных дэлегацый было заяўлена ў якасці кампаній-удзельніц. У выніку падпісаны кантракты на суму звыш як 266 мільёнаў долараў.

Навінкі, прадстаўленыя на выстаўцы, запатрабаваны часам і той неспакойнай абстаноўкай, якая апошнім часам пануе ў свеце. Сярод ноу-хау — комплексы радыёэлектроннай барацьбы, беспілотныя лятальныя апараты, бранятанкавая тэхніка, сістэмы супрацьпаветранай абароны, артылерыйскае і стралковае ўзбраенне, оптыка-электроннае абсталяванне і сістэмы, тэхніка і сродкі пажаратушэння, абмундзіраванне і сродкі індывідуальнай абароны і шмат іншае. Карэспандэнты «Звязды», якія працавалі на MILEX-2023, былі здзіўлены разнастайнасцю і шматфункцыянальнасцю многіх распрацовак. Аб некаторых з іх — у нашым рэпартажы.



Шматфункцыянальны беспілотны комплекс «Міратворац».



Новы штурмавы касцюм, распрацаваны спецыялістамі Нацыянальнай акадэміі навук.

### «Сапфір» і яго ювелірная работа

Увагу многіх наведвальнікаў выстаўкі прыцягнуў ручны супрацьтанкавы гранатамёт «Сапфір». Як сцвярджаюць спецыялісты, гэта гранатамётны комплекс новага пакалення. Ён лёгкі, малагабарытны, што немалаважна з пункту гледжання прымянення ў гарадскіх умовах. Маса зброі не перавышае 4,5 кілаграм, даўжыня — 750 міліметраў.

— Адной з найбольш важных асаблівасцяў комплексу з'яўляецца магчымасць злучэння некалькіх пускавых кантэйнераў і адначасовай стральбы з двух і больш вырабаў, злучаных паміж сабой, — адзначаюць распрацоўшчыкі гранатамётнага комплексу «Сапфір». — Гэта дазваляе трапляць у нашмат большую колькасць патэнцыяльных цэляў, якімі могуць быць танкі з актыўнай абаронай, шматлікія ўмацаванні, бункеры і іншае.

Гранатамёт здольны паражаць цэль на адлегласці да кіламетра. «Сапфірам», напрыклад, можна праламаць жалезабетонную сцяну таўшчынёй да 150 міліметраў, цагляную — да 250 міліметраў. Асколачнае дзеянне боепрыпаса дазваляе паражаць жывую сілу ў сродках індывідуальнай абароны ў радыусе да сямі метраў. Дзякуючы новаму высокаэнергетычнаму рухавіку, стральбу можна весці з закрытых памяшканняў.

Па словах спецыялістаў кампаніі, комплекс выкарыстоўваецца і ў якасці міні-РСЗА (рэактыўнай сістэмы залпавага агню) з розных платформ: трыногі, кіраванай перасоўнай платформы або дрона. «Кіраванне гранатамётам можа быць аддаленым: «начынка» комплексу поўнасцю лічбавая — пачынаючы ад пускавой прылады, заканчваючы ўзрывальнікам, — удакладняе галоўны канструктар распрацоўкі. — Што датычыцца гранатамётных сістэм, гэта першае такое рашэнне ў свеце. Камп'ютарызаваныя прыцэльныя прылады, распаўсюджаныя сёння на рынку, ужо зрабілі да нас. Такая ж лічбавая «начынка» комплексу з выбарам рэжымаў агню прадстаўлена ўпершыню».

Як паведамілі распрацоўшчыкі, гранатамёт знаходзіцца на этапе выпрабаванняў. Неўзабаве ён паступіць на ўзбраенне беларускай арміі.

### Беспілотнікі — пад кантролем

Абсалютна новая распрацоўка, прадэманстраваная на выстаўцы прадпрыемствам «Белспецзнештэхніка», — мабільная станцыя радыёэлектроннай барацьбы з беспілотнымі лятальнымі апаратамі, прызначаная для пошуку, разведкі і вызначэння месцазнаходжання БЛА.

Як расказаў **начальнік аддзела ДЗГУП «Белспецзнештэхніка» Сяргей АСВЯЦІМСКІ,** работу станцыі забяспечваюць дзве асноўныя сістэмы: разведкі і падаўлення. «Сістэма разведкі прадстаўлена трыма падсістэмамі і дазваляе вызначаць месцазнаходжанне беспілотных лятальных апаратаў пры дапамозе радыёразведкі, радыёлакацыйнай і аптычнай разведак, — удакладняе спецыяліст. — Радыёразведка ажыццяўляецца пры дапамозе ўбудаванай радыёлакацыйнай станцыі, аптычная разведка адбываецца з дапамогай оптыка-электроннага комплексу, размешчанага на пярэдняй мачце. На задняй мачце знаходзіцца сістэма падаўлення, якая ўздзейнічае на каналы кіравання і перадачы выяўленых даных БЛА, навігацыю асноўных навігацыйных сістэм, ажыццяўляецца пуфінг — стварэнне скажонага поля для беспілотных лятальных апаратаў».

Асноўныя тэхнічныя характарыстыкі станцыі: работа ў дыяпазоне — ад 200 да 6 тысяч Мгц, далёкасць радыёразведкі — да 50 кіламетраў, радыёлакацыйнай разведкі — да 22 кіламетраў, аптычнай разведкі — да 10 кіламетраў, далёкасць падаўлення каналаў кіравання і перадачы даных беспілотных лятальных апаратаў — да 30 кіламетраў, далёкасць падаўлення навігацыі — да 40 кіламетраў.

«У гэтай распрацоўцы мы ўпершыню прымянілі монастатычную радыёлакацыйную станцыю: восем радыёлакатараў ажыццяўляюць агляд па азімуце ў 360 градусаў, — заўважае Сяргей Асвяцімскі. — Другая навінка — пеленгатар-выявіцель малагабарытных дронаў. Апошні вопыт баявых дзеянняў паказвае, што цяпер любое сухапутнае падраздзяленне, нават самае дробнае, мае ў сваім штаце малагабарытныя дроны для вядзення разведкі, перамяшчэння боепрыпасаў і іншых мэт. Калі які-небудзь з дронаў пачынае працаваць у зоне вызначальных частот, аўтаматычна ўключаецца пеленгатар-выявіцель. Інфармацыю аб месцазнаходжанні беспілотнага лятальнага апарата дазваляе вызначаць спецыяльнае праграмнае забеспячэнне. Такім чынам, аператар засяроджваецца на найбольш важных аб'ектах, а сама станцыя ў аўтаматычным рэжыме абараняе аб'ект ад малагабарытных лятальных апаратаў».

### Адзін модуль замест дзесяці вогнетушыцеляў

Адна з вядучых айчынных кампаній, якая займаецца вытворчасцю электронных сродкаў барацьбы з агнём, — «Авангардспецмантажплюс» — на выстаўцы прадставіла сістэмы для выяўлення і тушэння магчымых пажараў на ваеннай тэхніцы. Такія сістэмы прымяняюцца і на буйных будаўнічых машынах, аўтобусах, іншых транспартных сродках. Напрыклад, сістэма «Багаж» дазваляе выявіць і запусціць працэс тушэння на ранняй стадыі ўзгарання. У прыватнасці, яна здольная абараніць ад пашкоджання кабіну, маторны адсек, хадавую частку.

Паклапаціліся спецыялісты прадпрыемства не толькі аб тым, як выявіць пажар, але і чым яго тушыць. Прэзентаваны падчас выстаўкі модуль парашковага пажаратушэння, які ўстанаўліваецца на тэхніку, аўтаматычна спраўляецца з узгараннем. Адна ўстаноўка можа патушыць пажар на плошчы 4 м$^2$. Прычым, за кошт камбінаванага тушэння, устаноўка здольная справіцца з агнём на паверхні. Як сцвярджаюць распрацоўшчыкі, нічога падобнага на постсавецкай прасторы няма. Аналагічныя модулі ствараюцца і ў іншых краінах, але патушыць адкрыты ачаг парашком пакуль могуць толькі сістэмы, створаныя беларускімі спецыялістамі.

— У модулі выкарыстоўваюцца два кампаненты, якія маюць вогнетушыльную здольнасць, — гэта аэразоль і парашок, — расказвае аб унікальнасці сістэмы **намеснік дырэктара ТАА «Авангардспецмантажплюс» Максім ПІНАЕЎ.** — Актуальнасць і неабходнасць гэтай распрацоўкі ўзнікла па той прычыне, што ні аэразоль, ні парашок паасобку не здольныя ў пэўных сітуацыях лакалізаваць ачаг узгарання. У нашым модулі выкарыстоўваюцца абодва кампаненты, якія дзейнічаюць па-рознаму, — назіраецца сінергетычны эфект. Парашок, які выкідваецца, збівае полымя з гаручай нагрузкі. Затым выходзіць аэразоль, якая выконвае некалькі функцый, у тым ліку тушыць пажар. Яшчэ адным немалаважным нюансам з'яўляецца шырокі тэмпературны дыяпазон (працоўная тэмпература ад -50 да +125), што дазваляе ўстанаўліваць модулі ва ўсе машыны ў любых кліматычных паясах.

Па словах **тэхнічнага кансультанта ТАА «Авангардспецмантажплюс» Дзмітрыя СЯНЬКО,** модуль парашковага пажаратушэння садзейнічае жыццеўстойлівасці тэхнікі. «Адзін модуль справіцца лепш, чым дзесяць вогнетушыцеляў, — падкрэслівае ён. — Асабліва гэта актуальна ва ўмовах баявога рэжыму: модуль абараняе тэхніку і асабовы склад, які ў ёй знаходзіцца. Ён гарантавана збівае полымя, тушыць агонь, што дае магчымасць працягваць баявую задачу. У выніку ні тэхніка, ні людзі не выходзяць са строю».

### Абарона ад куляў і асколкаў

Традыцыйна на MILEX свае навінкі прадстаўляе і флагман айчыннай навукі — Нацыянальная акадэмія навук. Адна з распрацовак, як запэўніваюць спецыялісты, створана літаральна некалькі дзён назад. Размова ідзе пра керамічны шчыт БР-5 класа, які вытрымлівае кулі снайперскай вінтоўкі Драгунова. Яго вага — 32 кілаграмы. Нялёгкі, вядома — затое ва ўмовах вядзення бавых дзеянняў ад яго залежыць многае. Для параўнання керамічны шчыт БР-4 класа важыць 25 кілаграмаў.



Распрацоўкі, створаныя на прадпрыемстве «ЛЭМТ», высокатэхналагічныя і запатрабаваныя сучаснай абстаноўкай.

У экспазіцыі НАН — і новы штурмавы касцюм з плечавымі і пахавымі элементамі, якія дагэтуль не былі прадугледжаны ў падобным абмундзіраванні. Як звяртаюць увагу распрацоўшчыкі, падобныя ноу-хау дыктуе спецыяльная ваенная аперацыя ва Украіне.

**Намеснік загадчыка сектара арганізацыі і развіцця вытворчасці Фізіка-тэхналагічнага інстытута Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Мікіта КУКРЭШ** паказвае пліты, якімі камплектуюцца сучасныя бронекамізэлькі, а таксама падбой пад тэхніку. «Ён устанаўліваецца на любую тэхніку: гэта можа быць бронетэхніка, аўтамабілі, катары, верталёты — усё, што заўгодна, — прыводзіць прыклад распрацоўшчык. — Калі дзесьці адбываецца выбух і бронеэлементы самой тэхнікі пашкоджваюцца, гэты элемент здольны ўтрымліваць асколкі, якія звычайна трапляюць у тэхніку. Безумоўна, гэта ратуе жыццё экіпажу. Яму неабходна пакінуць недзеяздольную тэхніку і перасесці ў іншую, пасля чаго працягваць выкананне пастаўленых задач».

Адна з навінак, створаная супрацоўнікамі Фізіка-тэхналагічнага інстытута НАН, — супрацьасколачная коўдра. Ёй можна накрыць любое выбуховае рэчыва, напрыклад знойдзенае ў горадзе, і выклікаць групу размініравання. Калі да прыбыцця сапёраў адбудзецца выбух, то ніякай пагрозы ён не нясе — асколкі застаюцца пад гэтай коўдрай.

### Высокаінтэлектуальныя напрацоўкі

Традыцыйна сваімі навінкамі ў галіне оптыка-электроннага высокадакладнага прыборабудавання здзіўляе Навукова-тэхнічны цэнтр «ЛЭМТ» Беларускага оптыка-механічнага аб'яднання. На выстаўцы — самыя перадавыя распрацоўкі. У прыватнасці, астуджальны цеплавізійны бінокль. Нягледзячы на тое, што гэты ручны камбінаваны прыбор аператыўнай разведкі невялікі па габарытах, ён выяўляе цэлі, якія знаходзяцца на адлегласці да 20 кіламетраў: можа выявіць як аўтамабіль, тэхніку, так і чалавека. Прыбор настолькі кампактны, што яго зручна насіць з сабой.

Вельмі важны кірунак, якім у цяперашні момант займаюцца спецыялісты прадпрыемства, — мадэрнізацыя супрацьтанкавых комплексаў тыпу «Конкурс», якія стаяць на ўзбраенні беларускай арміі. «Гэтая тэхніка вельмі надзейная, — звяртае ўвагу **намеснік дырэктара па оптыка-электронных прыборах Андрэй ВЯРШЫНІН.** — Пры гэтым яна патрабуе мадэрнізацыі. Мы распрацавалі і пастаўляем, у тым ліку ў Міністэрства абароны, цеплавізійны модуль для ўстаноўкі на штатнае месца прыцэльнага прыбора ТРК, які робіць яго ўсесутачным і ўсепагодным. Таксама мы перапрацавалі сам прыбор навядзення: можам яго ствараць, рамантаваць і мадэрнізаваць на сучаснай элементнай базе. Далейшае развіццё гэтага кірунку — мадэрнізацыя комплексу для магчымасці кіравання ракетамі па лазерным промні».

Распрацоўваюць на «ЛЭМТ» і трэнажоры для гранатамётаў, мінамётаў — для таго, каб спецыялісты атрымлівалі навыкі работы на гэтым узбраенні. Яшчэ адна новая распрацоўка — аўтаматызаваная сістэма кіравання агнём мінамётнай батарэі. «Гэта вельмі перспектыўная рэч, — акцэнтуе ўвагу Андрэй Вяршынін. — Аўтаматызацыя стральбы вельмі актуальная ў свеце падзей, якія адбываюцца ва Украіне. Яны паказалі, што трэба пераходзіць на камп'ютарную сістэму кіравання, паколькі гэта эфектыўна, сучасна і захоўвае многія жыцці».

Працуюць спецыялісты прадпрыемства і па такім актуальным кірунку, як выяўленне і барацьба з дронамі. Створаны комплексы для выяўлення, ідэнтыфікацыі і суправаджэння беспілотных лятальных апаратаў. Зусім новы кірунак распрацоўшчыкаў-інтэлектуалаў — барацьба з такімі аб'ектамі з дапамогай лазераў.

### І мішэнь, і сродак паражэння

Самых сучасных беспілотных лятальных апаратаў на выстаўцы было прадстаўлена ў вялікай колькасці. Цікавасць да беспілотнікаў з боку многіх аўтарытэтных прадпрыемстваў ваенна-прамысловага комплексу абумоўлена шырокім выкарыстаннем іх на сучасным полі бою. Любы канфлікт сучаснасці ўжо немагчыма ўявіць без гэтых жалезных «птушак», якія могуць выконваць шырокі спектр задач.

У прыватнасці, шматфункцыянальны беспілотны комплекс «Міратворац» прызначаны для вывядзення са строю лёгкабраніраванай і аўтамабільнай тэхнікі, падаўлення агнявых пунктаў праціўніка, размешчаных у цяжкадаступных месцах, паражэння наземных і марскіх цэляў. Беспілотнік здольны праводзіць разведку, наводзіць і карэкціраваць агонь у рэжыме рэальнага часу, знішчаць комплексы радыёэлектроннай барацьбы і супрацьпаветранай абароны праціўніка. Прызначаны для навучання разлікаў зенітна-ракетных комплексаў у выяўленні і знішчэнні паветраных цэляў. «З улікам сучаснай абстаноўкі гэта перспектыўная распрацоўка, якая неабходна нашай арміі для абароны тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы, здароўя і жыцця нашых грамадзян», — рэзюмаваў **намеснік начальніка аддзела выпрабаванняў ТАА «КБ «Беспілотныя верталёты» Віталь ЯРАШЭВІЧ.**

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

### У тэму

**Намеснік міністра абароны па ўзбраенні — начальнік узбраення Узброеных Сіл Беларусі генерал-маёр Андрэй ФЕДЗІН:**

— Мы вельмі дэталёва і ўважліва вывучаем досвед спецыяльнай ваеннай аперацыі. Спецаперацыя пацвердзіла высокую важнасць сродкаў супрацьпаветранай абароны, авіяцыі. Нельга скідаць з рахункаў і ўзбраенне сухапутных войскаў. У першую чаргу артылерыі, бранятанкавага ўзбраення і тэхнікі, любыя браніраваныя машыны, якія могуць выкарыстоўвацца на полі бою. Абарона ад беспілотнікаў — адзін з прыярытэтаў дзейнасці ваеннага ведамства. Гэта праблема з'яўляецца актуальнай не толькі па досведзе сучасных узброеных канфліктаў. Яна стала актуальная некалькі гадоў таму, і мы ўдзяляем гэтаму вялікую ўвагу.